Ірына Данеўская

# БАГУСЛАЎ РАДЗІВІЛ

## Нямецкі прынц з Вялікага Княства Літоўскага

*Пераклад з украінскай*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2018

УДК 821.161.2
ББК 84(4Укр)-44
Д17

Пераклад з украінскай Наталкі Бабінай паводле выдання:
Даневська І. Німецький принц Богуслав Радзивіл.
Київ: Темпора, 2016.

Мастак Мікола Койдан

**Данеўская, І.**
Д17 Багуслаў Радзівіл: Нямецкі прынц з Вялікага Княства Літоўскага / Ірына Данеўская ; пер. з укр. Н. Бабінай. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. — 684 с.
ISBN 978-985-7165-75-9.

«Багуслаў Радзівіл. Нямецкі прынц» — гістарычны раман вядомай украінскай пісьменніцы Ірыны Данеўскай, прысвечаны юнацтву і маладым гадам знакамітага прадстаўніка магутнага магнацкага роду з Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Аўтар, абапіраючыся на дакументы эпохі, стварае шырокае палатно бурлівага жыцця Багуслава Радзівіла. Ён увайшоў у гісторыю не толькі як таленавіты палітык і дыпламат, але і праславіўся подзвігамі на амурным полі, скарыўшы сэрца не адной прыгажуні.
Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 821.161.2**
**ББК 84(4Укр)-44**

**ISBN 978-985-7165-75-9**

© Даневська І., 2016
© Темпора, 2016
© Бабіна Н. В., пераклад на беларускую мову, 2018
© Афармленне. Выдавец А. М. Янушкевіч, 2018

# ПРАДМОВА
# ДА БЕЛАРУСКАГА ЧЫТАЧА

Хоць імя Багуслава Радзівіла, несумненна, знаёмае беларускаму чытачу, мяркую, што мой герой усё ж мае патрэбу ў рэкамендацыях. Гісторыю заўсёды пішуць пераможцы, а яна была вельмі суровай да князя. Мёртвым патрабуюцца жывыя адвакаты, але, на жаль, за 350 гадоў пасля смерці Радзівіл так і не дачакаўся «свайго» біёграфа, і, як вынік, непрадузятай біяграфіі. Але як бы там ні было, яго жыццяпіс заслугоўваў быць апісаным, бо Багуславу ўдалося пражыць надзіва бурлівае, яркае жыццё, здольнае выклікаць здзіўленне і захапленне ў сучасных чытачоў. Прыгажун, адчайны каханак, небяспечны дуэлянт і ў той жа час тонкі палітык, дыпламат, адважны военачальнік, які асабіста прымаў удзел у вядомых бітвах Трыццацігадовай вайны, шведскага «Патопу» і Хмяльніччыны... Таму, калі мне ў рукі патрапілі біяграфічныя запіскі, напісаныя часткова Радзівілам, часткова — яго сакратаром, а таксама пасмяротная біяграфія Багуслава, я адразу зразумела, што павінна з'явіцца гэтая кніга. Маштабны гістарычны раман-эпапея, які б дазволіў чытачу наведаць Англію часоў буржуазнай рэвалюцыі, Францыю эпохі Рышэльё і Мазарыні, Галандыю, Бельгію, Германію, Аўстрыю, Малдавію, Літву і Польшчу, перажыць разам з героем небяспекі на моры і на сушы, пабыць шкаляром, а затым і студэнтам універсітэта, пасяліцца ў вайсковым лагеры, прыняць удзел у баях, паядынках, павесяліцца на балях і ў жаночых пакоях, папрактыкавацца ў палітычных інтрыгах і, нарэшце, бліжэй пазнаёміцца з вядомымі асобамі сусветнай гісторыі.

Некалькі гадоў карпатлівай працы — і звесткі абедзвюх біяграфій мне ўдалося дапоўніць унікальнай інфармацыяй з навуковых даследаванняў і першакрыніц: асабістых лістоў і ўспамінаў Радзівіла, яго слуг, знаёмых і сваякоў. Так нарадзілася кніга, якую ўжо палюбіў украінскі чытач.

І я неверагодна шчаслівая, што зараз мае героі загаварылі на беларускай мове!

*Ірына Данеўская*

*Светлай памяці*
*маёй бабулі Сенык Марыі Іванаўны,*
*настаўніцы ад бога і цудоўнага чалавека,*
*прысвячаю*

Частка 1

# НА ПРЫСТУПКАХ ТРОНА

Раздзел 1

# ВЯРТАННЕ ДАДОМУ

*Гданьск — Ліхтэнберг — Вільня — Дзяляцічы*
*(1620—1629 гады)*

3 мая 1620 года ў слаўным Гданьску, марской браме Рэчы Паспалітай, у сям'і князя з Літвы Януша Радзівіла адбылася знамянальная падзея.

— Хлопчык, ваша княжацкая міласць, — аб'явіла павітуха. Толькі прыняўшы роды, яна ўжо спяшалася перадаць дзіця шчасліваму бацьку.

— Сын! — усклікнуў князь Януш. — Сын! Спадкаемца! Дзякую богу! Здаровы? — спытаў ён, усхвалявана разглядаючы немаўля.

Нібы зразумеўшы, што гаворка пра яго, малы так гучна закрычаў, што прысутныя засмяяліся і заляскалі ў ладкі.

— Здаровы, ваша міласць, — запэўніла павітуха. — Хай падорыць яму Госпад многія лета...

— Сын, — княгіня Альжбета, адкінуўшыся на падушках, таксама слаба ўсміхнулася. Князь асцярожна паклаў дзіця побач з маці і ўдзячна пацалаваў жонку.

Радзівіл быў жанаты другі раз. Меў дваіх дзяцей у шлюбе з першай жонкай, Сафіяй Слуцкай, апошняй з роду Алелькавічаў*. Гэта была палымяная абаронца праваслаўя, якую простыя

* Княжацкі род, які паходзіў ад кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча (?—1398).

людзі лічылі святой яшчэ пры жыцці, а царква прызнала такой пасля смерці. Сын і дачка памерлі маленькімі, а потым, у родах, аддала богу душу і сама княгіня. Патрэба мець сына, які б успадкаваў бацькаў тытул, вядомае імя і вялізныя сямейныя даходы, змусіла князя прасіць рукі прынцэсы Альжбеты Сафіі, дачкі брандэнбургскага курфюрста Іагана Георга. Другая жонка падарыла мужу сына, які, аднак, нядоўга пражыў на гэтым свеце. Пасля нарадзіліся дзве дачкі, але жаданага спадкаемца ўсё не было.

— Нібы праклён які, — наракаў Радзівіл, молячы бога аб літасці.

І вось нарэшце малітвы былі пачутыя. Сын, нашчадак магутнага роду, яшчэ ляжаў у калысцы, а залатыя трубы на княжым гербе ўжо веставалі яму слаўнае і няпростае жыццё...

У той жа вечар адбыліся і хрэсьбіны па рэфармацкім абрадзе, бо князь Януш быў кальвіністам. Пастар Георг Паўль спытаў імя малога і вельмі здзівіўся, пачуўшы, што княжыча вырашылі назваць Багуславам.

— Незвычайнае імя для вашага роду, — сказаў ён. — Аднак хай славіць бога, які даў яму жыццё, і айцец наш нябесны будзе літасцівы да яго.

— Амінь, — сказаў князь Януш і горача перахрысціўся.

Хросным бацькам *per procura** малога Багуслава стаў кароль Чэхіі і пфальцграф рэйнскі Фрыдрых, жанаты з дачкой англійскага караля Якава І Сцюарта Альжбетай. Малы княжыч па матчынай лініі меў сярод блізкіх родзічаў амаль усіх нямецкіх князёў і нават еўрапейскіх манархаў. Але магутныя Радзівілы, князі Свяшчэннай Рымскай імперыі, сваім багаццем маглі зраўняцца і з каралём.

Не хачу быць каралём, хачу Радзівілам, — жартавалі ў Літве. Бацька Багуслава быў не згодны. Энергічны князь падняў рокаш** супраць караля Жыгімонта, якога ненавідзеў за рэлігійны фанатызм і бязмежнае славалюбства, але пацярпеў паразу ў адкрытай барацьбе. Шукаючы саюзнікаў, ён звярнуў свой погляд на захад.

* Праз прадстаўніка *(лац.)*.

** Г. зв. «Сандамірскі рокаш» (1606—1609) супраць Жыгімонта III Вазы (1566—1632), караля польскага і вялікага князя літоўскага з 1587 года, караля шведскага ў 1592—1599 гадах.

У добраахвотным выгнанні спрабаваў стварыць агульнаеўрапейскую пратэстанцкую кааліцыю і нават набыў нямецкае графства Ліхтэнберг, каб засядаць у княжацкай радзе рэйхстага. А потым яшчэ і даслаў сватоў да дачкі курфюрста.

У Варшаве на гэтыя выбрыкі глядзелі спачатку з паблажлівай усмешкай, потым з гневам і, нарэшце, з вялікім непакоем. Князь Януш нядоўга радаваўся нараджэнню сына: падступны ўдар наёмнага забойцы асіраціў малога прынца. Пахаваўшы мужа, княгіня з дзецьмі перабралася ў Ліхтэнберг, а затым жыла пры двары брата Хрысціяна І Гагенцолерна, маркграфа Брандэнбург-Байройцкага, хоць князь Януш у сваім тастаменце і загадаў сыну да паўналецця жыць у Літве. Быў і яшчэ адзін загад у тым тастаменце, які меў вырашальнае значэнне для малога княжыча. Пасля гібелі бацькі яго лёсам і маёмасцю павінен быў займацца родны брат нябожчыка, польны гетман Вялікага Княства Літоўскага князь Крыштаф Радзівіл.

Калі Багуславу споўнілася восем гадоў, маці выйшла замуж за прынца Юлія Генрыха, сына герцага Саксэн-Лаўэнбургскага. Даведаўшыся пра гэта, князь Крыштаф даслаў паслоў з катэгарычным патрабаваннем аддаць пляменніка яму на выхаванне. Закон быў на баку апекуна, княгіня мусіла скарыцца.

* * *

22 жніўня 1628 года шыкоўны картэж, які вёз малога Радзівіла на радзіму, набліжаўся да Вільні — сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. Доўгае падарожжа змучыла Багуслава, і хуткае расстанне з маці і сёстрамі Альжбетай Элеанорай і Сафіяй Агнешкай, якія суправаджалі яго ў гэтай паездцы, зусім не радавала. Княжыч змрочна разглядаў зялёныя пейзажы за акном карэты, тужліва слухаючы выхаваццеля пана Даніэля Набароўскага*. А той ужо трэці раз апавядаў пра тое, як Лідзейка, легендарны продак Радзівілаў, параіў князю Нарымонту пабудаваць сярод балот і лясоў сваю сталіцу.

* Даніэль Набароўскі (1573—1640) — польскі барочны паэт, лекар і сакратар князя Януша Радзівіла (1579—1620).

Раптам карэту так страсянула на выбоіне, што Багуслаў, падляцеўшы ўверх, балюча стукнуўся аб драўляную аканіцу.

— Ich weiß nicht, ob dieser Ratschlag wirklich gut gemeint war*, — злосна абарваў ён выхавацеля, расціраючы пабіты лоб, дзе імгненна вырас вялізны гуз.

— Das war noch übrig, — уздыхнула княгіня. — Den Behutsamen behütet auch Gott!**

Але пачуць гэтыя мудрыя словы Багуславу перашкодзіў гучны грукат гармат і мушкетныя салюты.

— Wie war das?*** — устрапянуўся ён і зацікаўлена высунуўся ў акно карэты.

Уздоўж дарогі стаялі роўныя шэрагі нямецкіх пяхотнікаў і стралялі з мушкетаў, а наперадзе выступала паважная дэлегацыя ў даўгаполай мясцовай вопратцы, якая падалася княжычу нязвыклай і смешнай.

— Відаць, бурмістр і віленскія радцы, — задаволена сказала княгіня, якую ўсцешыла такая пышная сустрэча. — Гэтыя ўрачыстасці ў твой гонар, сын мой. Вунь і твой дзядзька выехаў нам насустрач.

Княжыч ужо заўважыў грознага, на выгляд яшчэ не старога мужчыну з пышнымі рудаватымі вусамі, таксама ўбранага па польскім звычаі. Мужчына стаяў паперадзе віленскіх ураднікаў разам з высокім рудавалосым хлопцам, апранутым на замежны лад.

— Ваша светласць памятае, што павінны паводзіць сябе як належыць прынцу? — хутка сказаў выхавацель, убачыўшы, што Багуслаў памкнуўся выйсці з карэты.

— Як тут забудзешся, калі ты, пан Набароўскі, пастаянна мне пра гэта нагадваеш, — рассеяна адказаў княжыч, уся ўвага якога была прыкавана да сваякоў.

Почат князя Крыштафа таксама ахапіла жывое ўзбуджэнне. Слугі ўспаміналі нябожчыка слуцкага князя і, з цікаўнасцю

* Не ведаю, ці варта было слухацца гэтай парады *(ням.)*.

** Гэтага яшчэ не хапала... Хто сам сябе сцеражэ, таго і бог беражэ! *(ням.)*

*** Што гэта было? *(ням.)*

ўглядаючыся ў галоўную карэту з нямецкімі гербамі, услых разважалі, ці будзе яго сын падобны да бацькі. Князь гетман з паблажлівай усмешкай слухаў тыя размовы.

— Януш, я цябе прашу, — звярнуўся ён да сына, які стаяў побач. — Будзь прыязным да брата і ветлівым з нашымі сваякамі. І стрымлівай свой нораў хаця б таму, што хутка сам пойдзеш у чужыя краі, а муж княгіні, прынц Юлій Генрых, імперскі генерал, зможа паспрыяць твайму знаёмству з еўрапейскім панствам.

— Ды добра, бацька, — адазваўся малады князь, нецярпліва пераступаючы з нагі на нагу. — Хоць нам, Радзівілам, патрэбна яго пратэкцыя, як пятая нага майму жарабцу...

І, не звяртаючы ўвагі на абураны погляд бацькі, працягнуў:

— А вось нямецкім скакунам яшчэ адна пара ног была б не лішняй, бо спяшаліся сюды, нібы грэшнік у пекла, і кішкі ў маім жываце ўжо даўно марша граюць.

Тым часам карэта ганаровых гасцей спынілася, і князь Крыштаф з сынам паспяшаліся насустрач сваякам. Іх шчырыя вітанні змяніліся гучнымі салютамі і пышнымі прамовамі віленскіх радцаў. І калі бурмістр у сваіх хвалебных прамовах дайшоў да «Boguslaus Radziwil, dei gratia dux Birzarum et Dubinkorum, Sluck et Copil, Sacri Romani Imperii Princeps»*, літоўскі гетман, выпусціўшы з абдымкаў юных прынцэс, агледзеўся вакол і, не пабачыўшы пляменніка, разгублена спытаў:

— А дзе ж Багуслаў? Дзе мой дарагі пляменнік?

— Толькі што быў тут, — разгубілася і княгіня ды таксама стала аглядацца ў пошуках сына. — Пан Набароўскі, дзе ж прынц? — звярнулася яна да выхавальніка.

Небарака, схапіўшыся за галаву, кінуўся шукаць Багуслава.

— Напэўна, выпаў па дарозе, — гучна фыркнуў Януш. — Вось бяда! Прынца згубілі!

— А не дачакаешся таго! — нечакана адказаў звонкі голас. — Я тут.

* Багуслаў Радзівіл, з ласкі божай герцаг на Біржах, Дубінках, Слуцку і Капылі, князь Свяшчэннай Рымскай імперыі *(лац.)*.

Павярнуўшы галовы, усе ўбачылі хлопчыка, які стаяў сярод нямецкіх пяхотнікаў, разглядаючы мушкет, з якога толькі што адсалютаваў нейкі жаўнер.

— Die Waffe ist gut! — пахваліў ён і, азірнуўшыся на вяяроў, дадаў ужо гучней:

— Und die Soldaten, die sind wahrscheinlich die besten in der Welt!*

— Gott möge behüten Euer Durchlaucht!** — дружна зараўлі тыя, і крыкі падхапіла ўся радзівілаўская чэлядзь.

— Радзівіл! — аж пляснуў у ладкі князь Крыштаф. — Наша кроў! — і ўсцешана азірнуўся на сына.

— Немец, — не змаўчаў Януш. — І мовай, і выглядам да нас не падобны.

Малады князь, вядома, меў рацыю, бо знешне Багуслаў сапраўды розніўся ад сваіх даўгатварых, высакалобых і рудавалосых сваякоў — нашчадкаў Радзівіла Рудога. Ён быў прыгажуном і ўжо добра ўсвядоміў сілу выразнага позірку сваіх бліскучых цёмных вачэй, якія мелі магічны ўплыў на нянек і выхавальнікаў. Яны не раз дапамагалі маломy дамагчыся задавальнення свайго капрызу ці пазбегнуць пакарання за свавольствы. Доўгія чорныя вейкі і выгнутыя бровы надавалі эмацыйнасці адкрытаму, з лёгкім здаровым румянцам кругламу твару, якому добра пасавалі і поўныя вішнёвыя вусны, і валявое радзівілаўскае падбароддзе з характэрнай ямкай, і моцны нос. Знешне малы нагадваў нябожчыка бацьку, так што князь Крыштаф, толькі зірнуўшы на пляменніка, адчуў, як у грудзях прыемна разлілася гарачыня: ён вельмі любіў старэйшага брата, у гонар якога назваў уласнага сына, а зараз бачыў перад сабой ягонага сына. Прыжмурыўшыся ад сонца, што сляпіла вочы, той глядзеў на Крыштафа родным, ну зусім Янушавым позіркам.

Гетман хутка падхапіў прынца на рукі і лёгка, як пёрка, падкінуў.

— А што, князь, адгадаеш, хто я такі?

* Добрая зброя!.. А салдаты, напэўна, найлепшыя ў свеце! *(ням.)*

** Няхай бог беражэ вашу высокасць! *(ням.)*

— Такі рыцар, як ты, пан, можа быць толькі маім дзядзькам, светлым герцагам Крыштафам Радзівілам, літоўскім фельдмаршалам, — хітравата адказаў Богусь.

— Пляменнік мой дарагі, — усцешыўся князь. — Як жа я рады цябе бачыць!

— І я рады, — запэўніў яго малы. — Толькі ведаеш што, дзядзька? Апусці мяне на зямлю, перад слугамі няёмка... Я ўжо не дзіця!

— Вядома, не, — князь з цяжкасцю надаў сабе сур'ёзны выгляд і толькі тады апусціў малога долу. — Рыцар! Сапраўдны рыцар!

Адчуўшы пад нагамі цвёрдую глебу, княжыч з палёгкай уздыхнуў і, прыбраўшы з вачэй непаслухмяныя цёмныя кучары, што лезлі на лоб, павярнуўся да брата, які стаяў побач і весела назіраў за ім.

— Ты, напэўна, мой кузэн, прынц Януш? — усміхнуўся ён. — А я Багуслаў.

— Сардэчна вітаем дома, княжа, — засмяяўся той, паціскаючы працягнутую руку. — Ты, кузэн, вялікі вырас ад нашай апошняй сустрэчы. Я цябе во такім памятаю.

І Януш паказаў рукамі памер, замалы і для нованароджанага кацяняці, бо сапраўды бачыў брата яшчэ немаўлём на пахаванні яго бацькі.

— А цяпер, бачу, ужо зусім ваяр, — працягнуў ён. — Пэўна, адразу ж паедзеш з дзядзькам на вайну шведа біць?

— Паеду, але трохі пазней, — нахмурыўся Багуслаў, бо бачыў, што кузэн смяецца з яго.

— Чаму ж? — весяліўся Януш. — Няўжо адвагі не хапае?

— Гэтага дабра досыць, займаць не трэба, — адрэзаў малы. — А вось шпага замалая. Трэба пачакаць, пакуль вырасце.

Ён выцягнуў з похваў цацачную рапіру і зноў схаваў яе.

Януш разявіў рот, а князь Крыштаф так і зарагатаў, а за ім — усе, хто быў пры гэтай размове. Багуслаў, не зразумеўшы прычыны весялосці, паціснуў плячыма і адышоў да маці і сясцёр. Насмяяўшыся, князь гетман зрабіў знак слугам, што можна ехаць. Госці і гаспадары пасядалі ў карэты і рушылі ў горад.

* * *

Багуслаў зацікаўлена разглядаў з акна карэты літоўскую сталіцу. Велізарнае прадмесце Вільні не цешыла вока багаццем і пышнасцю будынкаў. Вакол купіліся драўляныя дамкі, у якіх пад адным дахам жылі і людзі, і худоба. Старая дарога, хоць і забрукаваная, патанала ў брудзе нават такой сухатой, а смурод адкідаў з гарадскога рова адчуваўся нават у карэце. Аднак месцічы, якія сустракалі княжацкі поезд усмешкамі, цікаўнымі поглядамі і нізкімі паклонамі, усё ж развесялілі малога княжыча: новае жыццё, у рэшце рэшт, падалося яму не такім ужо змрочным...

Павярнулі на доўгую і шырокую Замкавую вуліцу, якая вяла да Верхняга замка, і нібы трапілі ў іншы свет. Раскошныя камяніцы, палацы вяльможаў, аточаныя зялёнымі садамі, нібы хваліліся адзін перад адным раскошай і багаццем.

— Тышкевічы, Трызны, Сапегі, — называў пан Набароўскі суседзяў. — Пацы, Хадкевічы, а вунь і Радзівілы.

Магутным Радзівілам належаў ладны кавалак Вільні: іх уладанні распасціраліся ад Ніжняга замка на некалькі міль уздоўж парослага хваёвым лесам левага рукава ракі Вяллі; частка Лукішак* з палацамі і дамамі каля Віленскай брамы, а таксама велічныя камяніцы на Татарскай, Вялікай і Замкавай вуліцах. Значная частка гэтага багацця належала асабіста Багуславу. Княжычу хацелася неадкладна агледзець свае ўладанні, асабліва раскошны палац на Антокальскіх пагорках — пазалочаныя дахі яго старадаўніх вежаў так спакусліва зіхацелі ўдалечыні. Але пан Даніэль, пачуўшы яго просьбу, толькі засмяяўся:

— Тады вашай княжацкай міласці прыйдзецца прапусціць не толькі сённяшнюю вячэру, але і некалькі наступных. Гэта справа не аднаго дня.

Багуслаў пагладзіў пусты жывот і мудра вырашыў адкласці агляд да сыцейшых часоў. А тым часам поезд павярнуў у палац князя Крыштафа, які вырашыў прымаць гасцей у сябе таму, што княгіня Лізавета з дачкамі неўзабаве павінна была

* Віленскае прадмесце.

вяртацца ў Саксонію, а княжыч з сённяшняга дня заставаўся ў дзядзькі.

У віленскім палацы князя Крыштафа малога Радзівіла чакала вялікае выпрабаванне: бедны княжыч, у якога даўно кішкі марша гралі ад голаду, яшчэ гадзіны дзве мусіў ветліва адказваць на вітанні шматлікіх гасцей і сваякоў. Яго разглядалі нібы цуд заморскі, а Багуслаў спрабаваць запомніць шматлікія абліччы ды імёны, якія хутка зліліся ў адно. Аднак Богусь трымаўся нязмушана і шчыра, і ніхто з найяснейшага панства нават не здагадаўся, што ў думках ён ужо не раз адпраўляў іх усіх разам і кожнага паасобку ў апраметную. Прысутныя былі ў захапленні ад малога, асабліва цётка Ганна з роду Кішак, жонка князя Крыштафа.

— Божачкі, — ускрыкнула яна, упершыню пабачыўшы пляменніка. — Які ж ты прыгажун, золатка маё. Ну далібог анёлак!

Януш, пачуўшы гэта, з'едліва фыркнуў, але, падавіўшыся слінай, натужліва закашляўся. А «анёлак», спрытна ўхіліўшыся ад цётчыных пяшчотаў, тут жа звярнуўся да выхавальніка, які за цэлы дзень набрыд яму сваімі павучаннямі:

— Чуў, пан Набароўскі, што сказала княгіня? — гучна прамовіў Богусь. — А ты мяне чарцянём клічаш.

Небарака гатовы быў скрозь зямлю праваліцца, але на яго ніхто не звяртаў увагі. Князь Крыштаф рагатаў да слёз. І Януш разам з ім. Малы «немец», як ён у думках ахрысціў Багуслава, яму ўсё ж прыйшоўся да душы. Праўда, добра паразумецца кузэнам тады не ўдалося. Шаснаццацігадовы Януш глядзеў на васьмігадовага Багуслава зверху ўніз. Да таго ж, ён дрэнна ведаў нямецкую, яшчэ горш — французскую, і не хацеў паказваць сваё невуцтва маламу, які вольна балбатаў і на той, і на другой, бо на гэтых мовах размаўляў двор яго дзядзькі-маркграфа.

Хутка стрыечным братам прыйшлося развітацца — Януш ехаў вучыцца ў нямецкія і галандскія ўніверсітэты. Выпраўляючы сына ў далёкую дарогу, князь Крыштаф не ўтрымаўся ад бацькоўскіх наказаў, якія, з улікам упартага і рэзкага характару князя Януша, былі не лішнімі.

— Акрамя іншых навук, каб добра вывучыў нямецкую і французскую, — строга загадаў ён сыну. — І гэта кажу не жартам, бо

імі каралеўскі двор размаўляе, таму ў Польшчы па-польску можаш і не гаварыць, калі тых моў ведаць не будзеш.

Януш неахвотна кіўнуў.

— Караля, памазанца божага, сам нідзе дрэнна не згадвай, — працягваў князь гетман. — А тых, хто будзе пры табе пра яго вялікасць казаць нешта благое, спыняй.

І, цяжка ўздыхнуўшы, дадаў:

— Словам, май розум, сынку. Ты яшчэ з хаты не з'ехаў, а нашы ворагі ў Варшаве ўжо пляткараць, што я цябе ў Францыю пасылаю, каб Гастону Арлеанскаму* польскую карону перадаць.

Малады князь скрыгатнуў зубамі.

— Галоўнае — з важнымі людзьмі сяброўства заводзь, — князь Крыштаф нарэшце дайшоў да галоўнага. — Асабліва з тымі, хто пратэстанцкай веры. І памятай, што наш родавы тытул князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі ў чужых землях вялікую вагу мае. Дык і паводзь сябе як належыць прынцу!.. Езуітаў сцеражыся, і асабліва арыянскіх прапаведнікаў**, гэтыя яшчэ больш небяспечныя, чым тыя чэрці ў расах... Ну, пра гэта я сам тваім дворскім слугам скажу... І лісты пішы. Мне, маці, сястры і Багуславу. Кузэн табе цяпер памерлых братоў замяніць...

Януш, які ненавідзеў пісаць, незадаволена скрывіўся, але пад цвёрдым бацькавым позіркам паабяцаў. З тым і з'ехаў у чужыя краі.

* Гастон Жан Батыст Французскі, герцаг Арлеанскі (1608—1660) — малодшы сын караля Францыі Генрыха IV (1553—1610).

** Арыяне — прыхільнікі арыянства — плыні ў хрысціянстве, якая існавала ў IV—VI стагоддзях у Александрыі. Назва вучэння паходзіць ад імені Арыя (256—336) — святара з Александрыі. У Рэчы Паспалітай у канцы XVI — першай палове XVII стагоддзя арыянства трансфармавалася ў сацыніянства (па імені філосафа Фаўста Соцына). Яго паслядоўнікі называлі сябе ўнітарыямі (лац. *Unitarii*) або польскімі братамі (лац. *Fratres poloni*), але ў народзе былі вядомыя як арыяне. Сацыніяне лічылі, што крыніцай ісціны з'яўляецца Святое Пісанне, але толькі тады, калі яно не супярэчыць розуму; адмаўлялі дагмат Тройцы, сцвярджалі, што Ісус Хрыстос быў чалавекам. Адмаўлялі існаванне першароднага граху і наогул псаванне маральнай прыроды чалавека праз грэхападзенне першых людзей; не прызнавалі сакрамантаў, малітваў за памерлых, культу святых, абразоў, адпрэчвалі ўсю знешнюю царкоўную абраднасць, шанавалі суботу.

* * *

Пасля ад'езду кузэна Багуслаў таксама меўся ўзяцца за вучобу. Але нашчадак Радзівілаў дрэнна ведаў польскую. Гэта ўгнявіла князя Крыштафа, і ён адразу ж загадаў пану Набароўскаму пазбавіцца ад «нямецкага духу», якім ад нараджэння быў аточаны княжыч.

Назаўтра пасля ад'езду маці і сясцёр у Саксонію Богусь, прачнуўшыся ранкам, знайшоў каля свайго ложка не звыклы аксамітны камзол з доўгім шэрагам срэбных гузікаў, а дзіўную даўгаполую адзежыну — такія насілі ў гэтай яшчэ чужой для яго краіне.

— Мяне тут, напэўна, дзіцём лічаць, — пакрыўдзіўся хлопец. Новы ўбор нагадаў яму доўгую дзіцячую кашульку, якую ён нядаўна насіў. — Няўжо дзядзька не заўважыў, што я ўжо штаны надзеў?

І хоць у яго новым адамашкавым даламане зашпількі былі залатыя, а не сярэбраныя, княжыч грэбліва адклаў яго ўбок і гучна паклікаў пана Набароўскага. А калі той з'явіўся, загадаў неадкладна прынесці яму звыклую вопратку. Выхавацель, які дзейнічаў па загадзе князя Крыштафа, рашуча адмовіўся.

— Вы цяпер у Літве, ваша княжацкая міласць, — сказаў ён. — А тут усе так апранаюцца.

Цёмныя вочы Багуслава дзіўна бліснулі.

— Я — не ўсе, пане Набароўскі, — з націскам сказаў княжыч. — Я — Радзівіл.

Сказаўшы так, ён спакойна лёг у ложак, апавясціўшы, што будзе там чакаць «свайго» адзення столькі часу, колькі слугам спатрэбіцца, каб яго прынесці. І як ні стараўся пан Набароўскі, уставаць княжыч адмаўляўся.

— Калі ваша княжацкая міласць слоў не разумее, дык я вазьму дубец, — урэшце не вытрымаў выхавацель. — Дзе ж гэта бачана, каб з-за такіх дурніц такую бучу падняць!

Багуслаў спадылба зірнуў на яго:

— А ты не баішся, пане Даніэлю, што калі я вырасту, дык дубец, якім пагражаеш, табе бокам выйдзе?

У Набароўскага і мову адняло. Прыйшлося небараку бегчы па дапамогу да князя Крыштафа. Той, які, як і ўсе Радзівілы, меў круты нораў. Выслухаўшы знiякавелага выхавацеля, князь гетман адправіўся ў пакой да пляменніка ўладжваць *conflictus**. Слугі, што трапляліся на яго шляху, разбягаліся ад яго грознага выгляду.

— Ну, пляменнік! — яшчэ з парога загрымеў ён. — Ты што гэта робіш? Ды я цяпер сам за дубец вазьмуся!

— Вядома, малога сірату пакрыўдзіць лёгка, — абразіўся Богусь, усё ж асцярожна пазіраючы на грознага сваяка: а раптам сапраўды адлупцуе? — А я толькі хачу быць падобным да свайго бацькі.

— Як? — здзіўлена перапытаў князь гетман.

— Мой бацька, хоць і быў літвінам, не насіў такой вопраткі. А я ўсё ж яго сын.

Князь Крыштаф пачухаў патыліцу. Гэта была чыстая праўда. А малы ліс, адчуўшы перамогу, не замарудзіў яе замацаваць:

— Дзядзька, мы ж не будзем сварыцца з-за такой драбязы?

І, даверліва ўсміхаючыся, працягнуў рукі насустрач князю, які, вядома, адразу схапіў пляменніка ў абдымкі.

Прыйшлося гетману пасылаць у Каралявец** па добрага краўца, які ўмеў кроіць вопратку на нямецкі ўзор, і залічваць яшчэ аднаго немца слугою двара яго светласці прынца Радзівіла. Маршалкам*** двара быў літвін — дасведчаны слуга радзівілаўскага дому Самуэль Пуцята. Ён павінен быў таксама займацца выхаваннем і здароўем Багуслава.

Гэтага суровага на выгляд, маладога яшчэ чалавека з кручкаватым носам, зямлістым тварам і непрыветным поглядам вострых камяніста-шэрых вачэй княжыч заўважыў яшчэ на тым першым урачыстым абедзе. Запомнілася, як Пуцята выгаворвае кухару за залішні шафран у тушанай заячыне. Моцай голасу Самуэль мог

* Супярэчнасць *(лац.)*.

** Каралявец, Кёнігсберг (цяпер Калінінград) — у XVII стагоддзі сталіца Усходняй Прусіі, у 1525—1657 гадах была ў васальнай залежнасці ад Рэчы Паспалітай.

*** Гэта значыць упраўляючым двара.

зраўняцца з самім князем-гетманам, і княжыч шчыра паспачуваў чэлядзі, якая павінна была служыць пад наглядам такога суровага пана. Цяпер жа па волі дзядзькі «суровы пан» павінен быў кіраваць яго жыццём, і Радзівілу, які пасля расстання з маці адчуваў сябе глыбока няшчасным, стала зусім маркотна. Змушана ўсміхнуўшыся, ён прывітаў новага выхаваўцеля, з пэўнай палёгкай заўважыўшы, што той няблага гаворыць па-нямецку.

Але на гэтым, здавалася, цноты пана Пуцяты і скончыліся. Да сваіх абавязкаў ён ставіўся залішне старанна, прыдзіркамі даводзіў слуг да слёз, усюды сунуў нос, а яшчэ (адзіны з усіх радзівілаўскіх слуг) атрымаў ад князя-гетмана права прызначаць пакаранне свайму выхаванцу.

Перш-наперш пан Самуэль знайшоў княжычу настаўніка — пастара Дземітровіча. Гэты выбар ухваліў і князь Крыштаф, які, нягледзячы на неверагодную занятасць, хацеў асабіста сачыць за выхаваннем пляменніка. Пад пільным наглядам пастара Богусь сеў за кнігі. Навукі даваліся яму лёгка — на вялікае дзядзькава здзіўленне, бо ні ён сам, ні ягоны сын не мелі да вучэння вялікай ахвоты. Назіраючы, як пляменнік упарта штудзіруе катэхізіс, літоўскі гетман, што ўсім сэрцам прыкіпеў да малога, мармытаў сам сабе:

— Нямецкая кроў, чорт яе бяры... Ці гэта ад Астрожскіх?* Тыя таксама любілі сляпіць вочы над прамудрымі фаліянтамі. Чуе маё сэрца, як вырасце, дык будзе яшчэ большы мудрэц за князя-канцлера Альбрэхта.

Але, скончыўшы ўрок, малы спрытна ўскокваў на падаранага дзядзькам поні ды выхопліваў з похваў цацачную шаблю або, узброіўшыся лукам, ладзіў паляванне на крумкачоў, што абсядалі радзівілаўскі дом у Даляцічах, куды княжацкі двор пераехаў з бурлівай Вільні. І гетман, пільным ваярскім вокам згледзеўшы ў пляменніку выдатныя рыцарскія здольнасці, усцешана вымаўляў:

— Радзівіл, хай там хоць што хочуць кажуць... Радзівіл!

* Маці бацькі Багуслава, князя Януша Радзівіла, была Кацярына Астрожская, дачка «некаранаванага караля Русі», князя Канстанціна Васіля Астрожскага (1526—1608).

* * *

А бяда тут як тут: у канцы 1629 года пры родах памерла княгіня Сафія Лізавета, пакінуўшы сіротамі Багуслава з сёстрамі і іх зводнага гадавалага брата Франца Германа.

Раней Багуслаў лічыў дні, пакуль зможа паехаць у Саксонію і наведаць родных. Але, пачуўшы страшную навіну, зачыніўся ў спальні, не выходзіў адтуль і не адгукаўся, нягледзячы на ўсе заклікі разгубленых слуг. На другія суткі занепакоены пан Пуцята прыдумаў залезці ў пакой праз акно, што і зрабіў, махнуўшы рукой на цырымоніі і пашану да статусу. Акно было занадта цеснае, і сытае чэрава выхавацеля засела ў ім, як добра падагнаны корак у бочцы з віном. У дадатак лесвіца, якой пан маршалак узлез, звалілася ўніз. Спалоханы чалавек завіс паміж небам і зямлёй, учапіўшыся рукамі ў раму, якая ўжо пагрозліва трашчала.

Богусь падышоў да акна, крадком выціраючы вочы рукавом кашулі. Схапіўшы за руку пана Самуэля, хлопец з вялікай цяжкасцю ўцягнуў яго ў пакой.

— Чаму ты не даеш мне спакою, пан Пуцята? — спытаў ён, калі абодва трохі аддыхаліся. — Я ж сказаў, што хачу пабыць у адзіноце.

— Не цяпер, — сказаў той. — Ваша княжацкая міласць ужо прапусцілі ўчорашнія абед і вячэру. Сёння прапусціце і снядана, а я не магу дазволіць, каб вы зноў засталіся галодным.

Не звяртаючы ўвагі на пратэсты прынца, ён падышоў да дзвярэй, адчыніў іх і загадаў слугам неадкладна накрываць на стол.

Багуслаў паеў, але без ахвоты. Чорная меланхолія апанавала заўсёды вясёлага ды гаваркога хлопца і паглынала яго знутры, нібы полымя — сухія дровы ў шматлікіх камінах княжацкага палаца. Пан Пуцята глядзеў на гэта і ціха ўздыхаў.

— Не тое каб я асуджаў князя-гетмана, але кепска ён прыдумаў, калі асіраціў пляменніка пры жывой матцы, — сказаў ён пану Набароўскаму. — А калі збіраўся так зрабіць, дык трэба было браць яго ў Літву яшчэ немаўляткам, а не тады, калі нямецкае выхаванне дзіцяці ўжо ў душу ўрэзалася, а разлука з роднымі сэрца разбіла.

— Гэта не дзіця, а міласцівы князь Свяшчэннай Рымскай імперыі, — усміхнуўшыся, запярэчыў пан Даніэль.

— Вось і растлумач зараз «міласціваму князю», што гэтыя гучныя замежныя тытулы, перад якімі схіляецца Еўропа, тут, у Рэчы Паспалітай, нічога не вартыя, — адрэзаў Пуцята. — І што ён такі ж падданы нашага караля, як ты, я і сам князь гетман, бо толькі з каралеўскай волі булаву ў руцэ трымае... Мы, вядома, можам навучыць нашага «міласцівага князя» польскай мове, але паляка з яго ніколі не зробім.

Пан Самуэль любіў пабурчэць, але, кажучы так, ён усё ж не перашкаджаў пастару лячыць зраненую душу выхаванца гаючымі казанямі. А калі слова Божае чаканай палёгкі так і не прынесла, пан маршалак узяўся за справу сам. Не даючы княжычу ні хвіліны для суму, Пуцята займаў увесь яго час рыцарскімі забавамі і муштрой. Зразумела, што Радзівілу было не да весялосці і ўсе забавы праходзілі без патрэбнага запалу і жадання, але выхавацель не адступаўся. Прыходзіў да хлопца на досвітку, быў з ім цэлы дзень, прыдумляючы новыя і новыя заняткі, і сыходзіў, калі Богусь быў такі знясілены ад стомы, што адразу ж засынаў, ледзь галава кранаўся падушкі...

Час лечыць нават раны, якія здаюцца невылечнымі, і на твар Багуслава нарэшце вярнулася ўсмешка. Вядома, ён ціха абураўся чэрствасцю пана Самуэля, лічачы таго бяздушным паленам. Аднойчы, калі пан Пуцята ўзяўся распавядаць на ноч адну са сваіх доўгіх гісторый, завяршэння якіх княжычу ніколі не ўдавалася даведацца (ён засынаў раней, чым аповед падыходзіў да канца), хлопец паслухмяна заплюшчыў вочы і прыкінуўся, што спіць, каб абдумаць, як яму цяпер жыць аднаму на белым свеце. І раптам Багуслаў здзіўлена адчуў, як суровы выхавацель клапатліва папраўляе коўдру, канец якой звесіўся на падлогу, а пасля шурпатая мужчынская далонь ласкава кранулася яго валасоў.

— Спі, мой любы хлопчык, — ласкава прашаптаў пан Пуцята. — Беражы цябе Госпад і ўсе яго анёлы.

Не верачы сваім вушам, Багуслаў непрыкметна расплюшчыў адно вока і асцярожна паглядзеў на выхавацеля з-пад доўгіх век. Здзіўлена заўважыў, што цяпер яго суровы твар быў нязвык-

ла мяккім, амаль пяшчотным, а любоў, якую пан Самуэль старанна хаваў ад свайго гадаванца, бо яна не ўпісвалася ў адносіны пана і слугі ды замінала выхаванню, цяпер адкрыта ззяла ў яго на твары.

— Я таксама цябе люблю, пан Пуцята, — сказаў ён нечакана для сябе.

Убачыўшы, што гадаванец не спіць, пан Самуэль аж скалануўся. Але потым яго камяніста-шэрыя вочы расчулена заблішчэлі, і, махнуўшы рукой на цырымоніі ды этыкет, ён моцна прыціснуў хлопца да сябе.

У тую ноч Багуслаў заснуў амаль шчаслівы. І хоць зранку пан Пуцята зноў узброіўся звыклай строгасцю, княжыча яна ўжо не палохала: адмычку да сэрца выхавацеля ён падабраў.

Раздзел 2

# ШКАЛЯР

*Кейданы*
*(1630)*

Крыштаф Радзівіл, князь на Біржах і Дубінках, быў адным з самых таленавітых военачальнікаў свайго часу. Ён паказаў свой талент у маскоўскіх войнах, змог у 1622 годзе з малымі сіламі адбіць Мітаву ў шведаў, якім камандаваў сам «Паўночны Леў» —кароль Густаў II Адольф. Багуслаў рэдка бачыў дзядзьку, бо той толькі рэдкім госцем бываў ва ўласным доме. Вядома, велізарнымі радзівілаўскімі ўладаннямі кіравалі дасведчаныя аканомы, але за імі трэба было прыглядаць, каб атрыманы прыбытак не апынаўся ў чужым кашальку. Велізарная братава спадчына, якой гетман займаўся з-за малалецтва пляменніка, прыносіла выгаду, але і дадавала клопатаў. Але больш за ўсё часу адымала палітыка, князь Крыштаф браў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці як сенатар і адзін з самых уплывовых магнатаў Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на такую занятасць, ён паспяваў сачыць за выхаваннем ды навучаннем і ўласнага сына, і пляменніка (пра поспехі княжычаў рэгулярна давалі справаздачу іх выхавацелі). Калі Багуслаў добра навучыўся па-польску, князь Крыштаф вырашыў, што княжыч павінен наведваць кальвінскую школу ў Кейданах — сталіцы гетманскіх уладанняў. І скіраваў туды двор малога Радзівіла.

Пакуль выхавацелі і слугі займаліся ўладкаваннем пасля пераезду, Богусь, якога стамляла іх празмерная апека, непрыкметна

выслізнуў з палаца агледзець горад. Кейданы здаліся яму падобнымі да велізарнага рынку. Горад стаяў на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, якія вядуць з Вільні ў Расены* і з Коўна** ў Рыгу, тут заўсёды, а не толькі ў кірмашовыя дні, было поўна гандлёвага люду. Купцы везлі тавар сухім шляхам і вадой — па шырокай і спакойнай рацэ Няцечцы, як яе называлі русіны, або Нявежысу, як казалі жамойты. Для іх выгоды на Няцечцы была зробленая гандлёвая прыстань. У заходнім прыгарадзе кіпела вялікае будаўніцтва — князь Крыштаф дазволіў там пасяліцца васьмі сотням немцаў-лютэранаў, і Багуслаў, вандруючы па горадзе, адчуваў сябе як дома — нямецкая мова гучала тут на кожным кроку. Але не толькі яна. Кейданы былі падзеленыя на ўмоўныя кварталы вакол шасці вялікіх гандлёвых плошчаў, дзе жылі прадстаўнікі кальвінісцкай, лютэранскай, арыянскай, каталіцкай, праваслаўнай і яўрэйскай абшчын. Больш за ўсё, вядома, было кальвіністаў, сярод якіх вылучаліся выхадцы з далёкай Шатландыі, уцекачы ў чужыя краі далей ад беднасці і рэлігійнага ўціску. Дзелавіты дух гэтай рэлігіі наклаў адбітак на гаспадарчы лад усяго горада. Тут не ўмелі гультаяваць, і нават па святах ці ў тыя гадзіны, калі вусны звыкла шапталі малітву, рукі гараджан былі занятыя справай, бо марнаванне часу лічылася найвялікшым грахом. Строгія парадкі дзівілі падарожнікаў, якія звыклі да святочнай будзённасці гарадоў Рэчы Паспалітай, затое для Багуслава, які добра памятаў нямецкія звычаі, жыццё тут было па-хатняму знаёмым і родным. Ён нават не крыўдзіўся на заклапочаных мінакоў, што няўхвальна пазіралі на хлопца, які павольна прагульваўся і яўна біў лынды. Агледзеўшы новую двухпавярховую школу і друкарню, дзе віравала праца, княжыч завярнуў у гарадскую ратушу. Туляючыся па цвінтары кальвінскага збору сярод патрэсканых ад часу, парослых мохам магільных пліт Багуслаў натрапіў на хлапчукоў — сваіх аднагодкаў. Яны пра нешта горача спрачаліся, і княжыч, якому бракавала дзіцячага таварыства, разгледзеўшы, што перад ім не прасталюдзіны, а шляхцічы, зацікаўлена падышоў бліжэй. У гэты

* Цяпер Расейняй.

** Цяпер Каўнас.

момант бялявы мажны хлопец дастаў з мяшка вялікага чорнага ката і, трымаючы яго за шкірку, паказаў таварышам. Тыя спалохана адступілі назад. Толькі адзін застаўся на месцы, няўхвальна гледзячы на гэтую забаву.

— Самуль, ты пэўны, што гэта вядзьмарскі кот? — спытаў ён, аглядаючы перапалоханае стварэнне, што мяўкала так, ажно Радзівіл, скрывіўшыся, заткнуў вушы пальцамі.

— А то які ж? — пакрыўдзіўся Самуль. — Ды сам паглядзі, Ян: чорны, як ноч, яшчэ і з зялёнымі вачыма. Напэўна з нячыстай сілай знаецца!

Ён тыцнуў ката недаверліваму таварышу пад нос, аднак русявы Ян, зазірнуўшы ў поўныя жаху кацiныя вочы, толькі пацiснуў плячыма.

— Кот як кот, — сказаў ён. — Пусці яго, Стаброўскі, бо ў мяне ў галаве звініць ад віскату.

— Нельга, — сказаў Самуль. — Калі гэта сапраўды нячыстая сіла ў кацiным аблiччы, дык яна аднойчы ў месячную ноч прыйдзе па вашы душы.

Хлопец злавесна абвёў позіркам прыціхлых таварышаў і зайшоўся нядобрым смехам.

— Ну і чаго ты іх палохаеш? — перабіў яго Багуслаў. — Калі б гэта сапраўды была д’ябальская істота, ты б ужо ляжаў на зямлі з разарваным горлам...

Хлопчыкам гэты аргумент падаўся пераканаўчым, і іх напалоханыя твары трохі пасвятлелі. Стаброўскі пачырванеў. Крутнуўшыся на абцасах сваіх ботаў, ён пагрозліва ўтаропіўся ў прынца. Простая будзённая адзежа Радзівіла ўвяла яго ў зман, і хлопец вырашыў, што мае справу з сынам аднаго з замежнікаў, якія, дзякуючы шчодрасці князя Крыштафа, ужо лічылі Кейданы сваёй радзімай.

— А ты хто такі? — груба спытаў ён. — Чаго сунеш нос у мае справы?

— Бо мне так захацелася, — адрэзаў Багуслаў.

Круглае як поўня аблічча Стаброўскага пачырванела ад злосці, а халодныя шэрыя вочы задзірліва заблішчалі. Хлопец шпурнуў убок ужо лішняга ката, які чорнай маланкай кінуўся прэч, а сам, сціснуўшы кулакі, падышоў да прынца.

— Ты, чужынец, лічыш, што можаш беспакарана тут нораў паказваць? — выскаліўся ён. — Прыйдзецца навучыць цябе ветлівасці.

Багуслаў нават збялеў: ніхто яшчэ не наважваўся так з ім размаўляць. Ён пільна агледзеў ворага. Той быў таўсцейшы за яго і здаваўся мацнейшым, але на такую абразу трэба было адказаць. Таму, не доўга думаючы, княжыч ударыў нахабніка кулаком у твар так, што той крывёй умыўся.

— Ты... дык вось ты як! — ускрыкнуў Стаброўскі і кінуўся на Багуслава.

Яны зацята біліся, аж пыл курэў. Хлопцы абступілі іх і падбухторвалі жартачкамі. Падтрымлівалі, вядома, свайго важака, які біў малога прынца, нібы пярыну выбіваў. Але калі Багуслаў вырваўся з учэпістых абдымкаў саперніка, асядлаў яго і, заламаўшы руку, пачаў біць кулакамі, куды мог дастаць, нават найбольшыя жартаўнікі прыкусілі языкі.

— Здаешся? — спытаў Радзівіл, калі вырашыў, што дастаткова правучыў ворага.

— Не, — выціснуў з сябе Самуль і адразу атрымаў некалькі ўдараў па рэбрах.

— Здаешся???

— Не, хоць і забі мяне! — аж завыў ад болю Стаброўскі.

Ён сабраў апошнія сілы і скінуў з сябе прынца, так, што той ногі задраў. Аднак Багуслаў адразу ўскочыў і ўжо чакаў нападу, сціскаючы кулакі. Убачыўшы, што перавага на баку напышлівага прыхадня, таварышы Самуля кінуліся ратаваць важака. Радзівіл нечакана для сябе апынуўся тварам да твару з чатырма праціўнікамі. Зразумеўшы, што гэта ўжо не жарты, ён схапіў нейкую ламачыну, якая, на шчасце, ляжала пад нагамі. Сціснуўшы яе ў руцэ як хвосткую палку, якімі часта ваяваў просты люд, з усяе сілы ўдарыў у лоб першага ж нападніка. Той ускрыкнуў і, трымаючыся за скрываўленую галаву, асеў на зямлю. А княжыч, не даючы хлопцам апамятацца, раздаваў шчодрай рукой направа і налева добрыя ўдары. Цяжэй за ўсё яму прыйшлося з Янам, які таксама ўзброіўся зручнай палкай і арудаваў ёю, нібы шабляй. Яго таварышы, ужо не адважваючыся лезці ў бойку, шпурлялі ў прынца засохлымі землянымі камякамі

і камянямі. Як бы адважна ні біўся Багуслаў, ўсё ж сіла была не на яго баку. І невядома, чым бы скончылася сутычка, калі б на шум не прыбеглі мінакі з мясцовым пастарам. Той, размахваючы цяжкім дубовым кіем, задыхана крычаў нешта пра непавагу да мёртвых і да святога месца. Убачыўшы іх, падшыванцы пакінулі прынца ў спакоі і ўцяклі. Радзівіл таксама не жадаў слухаць натацыі раз'юшанага пастара, таму кінуўся следам. Хутка ён дагнаў Самуля і Яна, якія беглі наперадзе. Тройца завярнула ў глухі завулак і, цяжка дыхаючы, спынілася. Багуслаў знясілена прыхінуўся да сцяны нейкага дома і ад усёй душы ў думках падзякаваў пану Набароўскаму, які кожную раніцу муштраваў яго фізічнымі практыкаваннямі, прымушаючы падымаць цяжар, «каб сілу ў плячах меў», а пасля такіх здзекаў яшчэ і ганяў мілі дзве вакол палаца, павучальна паўтараючы ўслед за Ювеналам*: «Mens sana in corpore sano»**.

— Бягуць? — трымаючыся за грудзі, прахрыпеў Стаброўскі, трывожна ўслухоўваючыся, ці не чуваць пагоні.

— Здаецца, ціха, — выдыхнуў Ян і ўпаў на зямлю як падкошаны, таму што ногі яго ўжо не трымалі.

Самуль з палёгкай уздыхнуў і таксама сеў дзе стаяў.

Апамятаўшыся пасля шалёных уцёкаў і трохі аддыхаўшыся, хлопцы з цяжкасцю ўсталі, з цікавасцю пазіраючы на Багуслава, які спадылба назіраў за імі.

— Добра б'ешся, — з павагай сказаў Самуль і, падумаўшы, працягнуў княжычу руку: — Я Стаброўскі, сын тутэйшага аканома яго міласці князя Радзівіла.

Багуслаў фыркнуў і адвярнуўся.

— Ты не сярдуй, што мы на цябе ўчатырох напалі, — прымірэнча сказаў Ян, правільна вытлумачыўшы пагарду. — Прыйшлося ратаваць таварыша. Калі б мы не ўмяшаліся, ты б з нашага Самуля кавалак мяса зрабіў.

Стаброўскі нахмурыўся, але нічога не сказаў. Радзівіл паглядзеў на Яна: яму спадабаўся яго прыемны, адкрыты твар.

— Ты хто? — ужо трохі лагодней спытаў княжыч.

* Ювенал Дэцым Юній (каля 60 — каля 127 года) — рымскі паэт-сатырык.

** У здаровым целе — здаровы дух *(лац.)*.

— Ян Невяроўскі, — сказаў хлопец. — Сын беліцкага старосты князя-гетмана Радзівіла.

Багуслаў злёгку ўсміхнуўся, але адразу паморшчыўся — балела разбітая падчас бойкі губа, і павольна налівалася сіняком падбітае вока. Сапернікі выглядалі не нашмат лепш — на Стаброўскім, здавалася, і жывога месца не засталося, а Невяроўскаму бракавала пярэдняга зуба.

— Добра, — сказаў княжыч. — Я запомню.

І пайшоў. Хлопцы праводзілі яго здзіўленымі поглядамі.

* * *

Праз некалькі дзён Багуслаў у суправаджэнні самага паважанага са слуг князя-гетмана, кейданскага старосты Пятра Кахлеўскага ды пана Пуцяты ўпершыню пераступіў парог школы, дзе павінен быў вывучыць рускую* (мову Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага), латынь, а таксама арыфметыку, геаграфію, гісторыю і Закон Божы. Сустракаць прынца выйшлі ўсе настаўнікі на чале з рэктарам Янам Дамазовіусам. Рэктар ззяў ад задавальнення, бо Багуслаў адной сваёй прысутнасцю дадаваў гонару школе і цэламу гораду. Ён радасна вітаў Радзівіла і нават здолеў зрабіць выгляд, што не заўважае ні падбітага ў бойцы вока, ні падрапанага твару прынца.

Разам з рэктарам Багуслаў зайшоў у школьны пакой. Ён здаваўся зручным і ахайным, тут мелася ўсё неабходнае для навучання. Прынамсі, у шафах хапала кніг, каля шырокай лавы ў куце — хвосткіх розаг, а сцены былі ўпрыгожаныя картамі і галандскімі гравюрамі. Школьнікам ужо паведамілі, хто будзе вучыцца разам з імі, і яны дружна ўсталі, з цікавасцю разглядаючы Радзівіла. І двое не стрымалі спалоханага «ох!», пазнаўшы ў юным князю нядаўняга саперніка.

— Невяроўскі! Стаброўскі! — закрычаў пан Дамазовіус. — Што з вамі?

Хлопцы выцягнуліся, стараючыся не глядзець на Багуслава, а той не змог стрымаць зласлівай усмешкі, заўважыўшы,

* Аўтар мае на ўвазе старабеларускую мову. — *Рэд.*

як спалохана выцягнуліся іх твары. Хлапчукі нават затрэсліся, убачыўшы, што Радзівіл ідзе проста да іх. Але Багуслаў спакойна прайшоў міма да свайго пачэснага месца ў першым шэрагу — вучняў у тыя часы рассаджвалі паводле паходжання і становішча іх бацькоў. Калі Радзівіл зручна ўладкаваўся на лаве, рэктар дазволіў вучням сесці і, кіўнуўшы настаўніку, што можна пачынаць урок, выйшаў. Але асоба Багуслава цікавіла прысутных мацней за нудныя практыкаванні.

— А цікава, чаму ў княжыча морда такая, нібыта ёю чэрці ў ступе мак таўклі? — ляпнуў нехта з школьнікаў на вуха Стаброўскаму.

Самуль са злосцю штурхнуў хлопца локцем, і той пакрыўджана змоўк.

— Мяне бацька і так ледзь не забіў, калі даведаўся, што я зноў у бойку, як просталюдзін, палез, — прашаптаў ён Яну. — А як даведаецца, што я падняў руку на Радзівіла...

Ён цяжка ўздыхнуў.

— Весела, што і казаць, — сказаў Невяроўскі. — А што з намі зробіць князь гетман, я баюся і думаць.

З такімі сумнымі думкамі навука не лезла хлопцам у галовы, таму абураны настаўнік нацягнуў ім каўпакі з аслінымі вушамі, строга папярэдзіўшы, што ў наступны раз яны атрымаюць больш суровае пакаранне. І хоць хлопцы выглядалі пацешна, ніхто і не падумаў смяяцца: усе занадта добра ведалі сілу іх кулакоў.

Пасля заняткаў сябры, закінуўшы ганебныя каўпакі ў далёкі кут, папляліся да Багуслава з прабачэннямі — і за сябе, і за таварышаў-арыянаў, якія наведвалі іншую школу.

У Радзівіла, якому дасталася ад пана Пуцяты і за самавольны шпацыр па горадзе, і, тым больш, за бойку, аж рукі свярбелі зноў даць хамам па зубах, але ён вырашыў злітавацца.

— Не бойцеся, — сказаў ён. — Я не згадваў вашых імёнаў.

* * *

Невяроўскі і Стаброўскі, здаецца, нарадзіліся пад шчаслівай зоркай, бо прыкрае здарэнне нечакана прынесла ім удачу. Князь

Крыштаф, якому са спазненнем данеслі пра бойку, даведаўшыся, што пляменнік выстаяў супраць чатырох сапернікаў, нават не стаў сварыцца («сварыўся б, каб ён спіну паказаў!»), затое вырашыў, што Багуславу патрэбныя таварышы ў дзіцячых забавах. Паколькі ў Кейданах для Радзівіла не было годнага таварыства, гетман дазволіў княжычу выбраць сяброў самому. Багуслаў паказаў на Невяроўскага, а потым, прыслухаўшыся да просьбаў Яна, які прасіў не разлучаць яго з таварышам, пагадзіўся і на Стаброўскага. Цяпер хлопцы мелі жыць у гетманскім палацы на поўным забеспячэнні.

Ян і Самуль са страхам пераступілі парог радзівілаўскага дома, які асляпіў іх харастvом. З палёгкай хлопцы даведаліся, што грозны літоўскі гетман быў у чарговым ад'ездзе, а княгіня Ганна не ўмешвалася ў выхаванне Багуслава, бо князь Крыштаф строга загадаў выхавацелям, каб не дазвалялі пляменніку бавіць шмат часу ў жаночым таварыстве.

— Хіба што за вячэрай, — падкрэсліў ён. — А то каля белагаловых* і сам бабай стане.

Тут жа, у палацы, жыла і малодшая сястра Януша, шаснаццацігадовая Катарына. Пра князёўну казалі, што ў ёй ажыла прыгажосць самой каралевы Барбары**. Высокая, гожая, рудавалосая, з цёмна-сінімі, як у бацькі і брата вачыма, дасціпным вострым розумам і моцным характарам — бацькі на яе проста маліліся, спадзеючыся для дзіцяці вялікай будучыні. Дый ці магло яно быць іншае ў дачкі Радзівілаў, якія здаўна радніліся з еўрапейскімі ўладарамі?

Каля князёўны і княгіні жылі некалькі асірацелых дзяўчат з высакародных літоўскіх сем'яў, бо, паводле тастамента бацькоў, іх галоўным апекуном лічыўся князь гетман. Дзяўчаты весялілі палац сваім шчабятаннем, вучыліся гаспадарыць і годна

* Белагаловыя — іранічная назва жанчын; у сярэднявеччы жанчыны насілі на галаве белую намітку. Гэтае слова так трывала ўвайшло ў польскую мову, што ўжывалася і тады, калі звычай накрываць галаву наміткай застаўся ў мінулым.

** Барбара Радзівіл (1520—1551) — жонка вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта II Аўгуста. Рамантычная гісторыя іх кахання лягла ў аснову шматлікіх мастацкіх твораў.

паводзіць сябе, а, выходзячы замуж, кожная з іх атрымлівала добры пасаг ад княгіні і князя. Але жаночы двор жыў асобным жыццём, і Невяроўскі са Стаброўскім хутка зразумелі, што па-сапраўднаму ў новым доме баяцца трэба было пана Пуцяты: маршалак двара юнага Радзівіла старанна сачыў за ўсім, што тычылася яго гадаванца. Паны Набароўскі і Кахлеўскі не толькі ўсюды вынюхвалі, але і паведамлялі гетману пра найменшыя драбніцы жыцця княжыча і яго слуг. Грубаваты Стаброўскі зусім не прыйшоўся ім да душы, і хоць бацька Самуля быў з усімі выхавацелямі ў добрых адносінах, хлопцу даводзілася са скуры лезці, каб дабіцца іх прыхільнасці. Невяроўскаму пашэнціла больш. Яго прыемная знешнасць і ўменне годна трымацца ў паважным таварыстве зрабілі лепшае ўражанне, таму Ян меў у палацы ці ні найбольшую свабоду. Яго адносіны з Багуславам мала нагадвалі стасункі пана і слугі, а ў гульнях і рыцарскіх забавах мяжа зусім сціралася. Хлопцы разам вучыліся ездзіць верхам, страляць з лука, практыкавацца з кароткай лёгкай дзідай і з дзіцячай шабляй. Ахвотна гулялі ў цуркі-палкі, перакідвалі набіты пакуллем мяч, кідалі нажы ў намаляваную цэль, але для дзіўнай гульні ў шахматы, якой яшчэ ў юнацтве навучыўся пан Набароўскі падчас еўрапейскіх падарожжаў з нябожчыкам бацькам Багуслава, цярпення хапала хіба ў княжыча. Куды весялейшым былі звычайныя косці і карты з гетманскімі ваякамі. Пастар Дземітровіч скоса паглядаў на такія забавы, час ад часу нагадваючы пра іх грэшную сутнасць, але на яго ніхто асабліва не звяртаў увагі: уменне гуляць і выйграваць было неабходна свецкаму чалавеку.

Лад жыцця ў палацы падпарадкоўваўся тым жа правілам, па якіх павінна жыць кожная кальвінісцкая сям'я: час, адпушчаны богам для зямнога жыцця, не павінен праходзіць марна. Княгіня Ганна была дбайнай гаспадыняй і старанна сачыла за працай слуг ды аканомаў. З-за слабага здароўя і прыроджанай строгасці яна не любіла гучных забаў, якія распачыналіся ў палацы з прыездам князя Крыштафа і яго паважаных гасцей. Але і гэтыя пышныя балі былі праявамі не ганарыстасці або марнатраўства, а гасціннасці, якой так славілася Рэч Паспалітая. І шчодрасць гаспадара павінна была прадэманстраваць павагу да гасцей ды засведчыць

яго дабрабыт. Зручнасць і добры густ цаніліся вышэй за паказную пышнасць, але не было тут месца і сумнаму аскетызму, бо, як казаў сам Кальвін*, чалавек прыходзіць у гэты свет, каб найбольш поўна праявіць свае таленты ды прынесці карысць сабе, людзям і Айчыне. Багацце было самым красамоўным паказнікам поспеху, а беднасць лічылася амаль грахом і выклікала пагарду ў тых шчаслівцаў, якія ўпартай працай і талентам дасягнулі поспеху. У пашане была добрая адукацыя, таму нават у вольны ад школы час выхавацелі і настаўнікі з усіх сіл спрабавалі набіць як мага больш ведаў у галовы княжыча і яго сяброў. А тыя з маладой легкадумнасцю ўсяляк спрабавалі пазбегнуць заняткаў.

Вучоба, рыцарскія забавы, кароткія шчаслівыя хвіліны вольнага часу — так міналі дні і месяцы. Зрэдку прыходзілі заўжды чаканыя лісты ад князя Януша. Той, вырваўшыся з-пад бацькоўскай апекі, спрабаваў жыць сваім розумам і, здавалася, цалкам падпарадкаваў сваёй волі выхавацеляў, якія, замест таго каб перапыняць капрызы свайго гадаванца, усяляк патуралі ім. Вучыўся князь толькі для адводу вачэй і, памятаючы бацькавы наказы, весела бавіў час у таварыстве ўплывовых людзей. Трохі затрымаўшыся ў Берліне, дзе пабратаўся з будучым курфюрстам Фрыдрыхам Вільгельмам, Януш наведаў князя Ангальта і нарэшце спыніўся ў Дрэздэне пры двары электара Саксоніі. Там пасля смерці маці выхоўваліся яго кузіны — сёстры Багуслава.

Узрадаваўшыся сваяку, князёўны перадалі праз яго лісты брату. Яны скардзіліся на жабрацкі побыт пры двары курфюрста Іагана Георга, уладанні якога былі спустошаныя Трыццацігадовай вайной. Багуслаў засмуціўся, прачытаўшы іх журботныя пасланні. На шчасце, дзядзька якраз быў у Кейданах, і княжыч шукаў зручнага выпадку папрасіць яго, каб той запрасіў сясцёр у Літву. Заспець дзядзьку ў адзіноце было амаль немагчыма. Заўсёды знаходзіліся нейкія клопаты, ад якіх не было адпачынку. Хапала і просьбітаў, што пераследавалі гетмана з раніцы да ночы. Усведамляючы гэта, Багуслаў вырашыў не адкладаць размову,

* Жан Кальвін (1509—1564) — рэлігійны рэфарматар, заснавальнік кальвінізму.

і, дазнаўшыся ў першага-лепшага слугі, дзе дзядзька, накіраваўся ў паказаным кірунку. Ён мог нічога не пытацца, бо рэха грамавога голаса князя-гетмана было чуваць здалёк.

Багуслаў, які ўжо прывык да дзядзькавых разносаў, спакойна зайшоў у пакой, спрабуючы ўгадаць, што магло гэтак раззлаваць князя. Акрамя Крыштафа, у пакоі быў яшчэ ягоны сакратар Ян Мяржынскі і незнаёмы княжычу малады чалавек, якому, відавочна, і адрасаваліся княжацкія грымоты з маланкамі. На Багуслава ніхто не звярнуў увагі. Княжыч спакойна залез у любімае дзядзькава крэсла і стаў глядзець камедыю, бурнае дзейства якой ужо набліжалася да кульмінацыі.

— ...Ты, мярзотнік, не толькі высакародную дзяўчыну зняславіў, ты, нягоднік, бацьку яе, менскага ваяводу, ледзьве на той свет не адправіў і слуг яму перабіў! — роў князь Крыштаф, наступаючы на юнака, нібы на ворага ішоў на чале сваіх харугваў.

Але той стаяў спакойна і глядзеў у вочы ашалеламу Радзівілу, які лютаваў так, што шыбы дрыжалі, а ў бледнага, як пабеленая сцяна княжацкага палаца, пана Мяржынскага пачалі падгінацца калені. Багуслаў з уласнага досведу ведаў, як цяжка выстаяць перад разгневаным дзядзькам, таму нямала здзівіўся такой вытрымцы і вырашыў уважлівей прыгледзецца да гэтага героя.

Шляхціцу на выгляд было крыху больш за дваццаць. Быў ён сярэдняга росту, хударлявы, на першы погляд (гэта ж трэба!) нават кволы, аднак шырокія рукавы зялёнага кафтана хавалі добра развітыя плечы і жалезныя мышцы, якія сведчылі пра вялікую фізічную сілу. Малады чалавек стаяў спінай да Багуслава, і калі выпадкова павяртаў галаву, княжыч бачыў яго прыгожы твар, ад тонкіх рысаў якога лёгка магла страціць розум любая дзяўчына. Аднак сам шляхціц калі і ведаў пра сілу сваёй прывабнасці, дык ставіўся да яе занадта нядбала, як да каштоўнай рэчы, што выпадкова трапіла ў рукі. Яго чорныя, бы вароніна крыло, гладкія бліскучыя валасы былі даўжэйшымі, чым звычайна мелі польскія і літоўскія шляхціцы, аднак не ведалі рукі майстра куафюру, і былі нядбайна падстрыжаныя самім шляхціцам або яго няўмелым слугой. Старанна паголенае валявое падбароддзе, тонкія чорныя вусы, удала падабраная вопратка хутчэй сведчылі пра добры густ,

чым пра жаданне рабіць прыемнае ўражанне: занадта ўжо драпежнай была яго ўсмешка. А дзіўны погляд вачэй — чорных, нібы бездань, і калючых, як добра навостранае лязо нажа, — хутчэй пасаваў бы галаварэзу з лясной дарогі, чым шляхціцу з паважанай сям'і, якім, без сумневу, быў малады рыцар.

— Хвалілася каза, што воўка заб'е, а той ад небаракі толькі рожкі ды ножкі пакінуў, — фыркнуў ён у адказ на папрок патрона. — Міласцівы князю, я ж не нейкае там кацяня, каб проста так дазволіць слугам пана ваяводы сябе ўтапіць. А пан Тышкевіч хай свечку богу паставіць і каню свайму найлепшага аўса дасць за тое, што вынес яго старыя косці з бяды, якую ён сам на сваю галаву наклікаў. Я яго дачку да кахання не прымушаў...

Яго мяккі аксамітны голас і стрыманыя рухі супярэчылі жорсткай усмешцы, і таму сказаныя словы прагучалі асабліва злавесна.

— Але з-за цябе, нягоднік, не толькі сенатарская дачка цноту страціла, але і ў дзвюх дзевак з фраўцымеру княгіні жываты павырасталі! — зноў загрымеў князь гетман. — Хіба ў тваім Зембіне сцежкі да дзявочых святліцаў лесам параслі, што ты пад маім дахам распусту чыніш, ганьбячы і дом мой, і маё імя?

Багуслаў чакаў, што паганец на гэтыя словы пачне ўслых смяяцца, аднак, на яго здзіўленне, той вінавата апусціў галаву.

— Вінаваты, міласцівы князю. Не варта мне было пляваць у калодзеж, з якога ваду п'ю... Карай, я любую кару прыму і міласці прасіць не буду.

— А-а-а, спахапіўся, чорт! — гетман моцна схапіў за горла маладога шляхціца і выпусціў, толькі калі той ужо пачаў хрыпець.

— Яшчэ крыху, і ты б, твая міласць, душу з мяне выціснуў, — закашляўшыся, выдыхнуў небарака, трымаючыся за горла, на якім відаць быў адбітак жалезнай гетманскай рукі.

— І гэтым бы тваёй душы вялікую паслугу зрабіў, — адрэзаў Радзівіл. — Бо ты, нягоднік, яшчэ грашыць не стаміўся, і калі тваё жыццё падыдзе да канца, то з вялікім цяжарам на той свет пойдзеш... Ох, калі б не твая адвага падчас апошняй вайны і не тая вялікая дружба, што мяне з тваім нябожчыкам-бацькам яднала, я б з табой, Адам, інакш пагаварыў.

— Можаш не турбавацца, міласцівы князю, — буян злёгку ўсміхнуўся, убачыўшы, што навальніца прайшла. — Бо пан Тышкевіч, напэўна ж, паспрабуе паскорыць мой канец.

Гэтыя словы, хоць і сказаныя з бесклапотнай бравадай, улагодзілі князя Крыштафа, і ён трохі супакоіўся.

— З ваяводам я ўжо дамовіўся, — памаўчаўшы, сказаў князь. — Ён пагадзіўся аддаць за цябе дачку.

Шляхціц ажно рот разявіў.

— Жаніцца? — збянтэжана спытаў ён. — Ну, не! І я, міласцівы князь, хутчэй зраблю, як той разбойнік, якога тры дні таму павесілі на гарадской плошчы. Нейкая дзяўчына захацела яго мужам узяць і так па старым звычаі ўратаваць ад смерці. А той, пабачыўшы, што нявеста крывая на адно вока, сам сабе на шыю вяроўку накінуў.

Багуслаў засмяяўся, ды яго ніхто не пачуў, бо князь Крыштаф, ускіпеўшы ў адказ на такую няўдзячнасць, зноў выбухнуў лаянкай. Але гнеўныя словы адскоквалі ад шляхціца, як гарох ад сіта, таму, пераканаўшыся, што справы не будзе, гетман, які, відаць, моцна любіў гэтага падшыванца, вырашыў зайсці з іншага боку.

— Ажэнішся, як я загадаю, — ужо зусім спакойна сказаў ён, паклаўшы на плячо шляхціцу сваю шырокую далонь. — Я ж, Адам, загадваю табе гэта зрабіць, таму што не бачу, як інакш скончыць справу мірам. У рэшце рэшт (ён глыбока ўздыхнуў), я спадзяюся, што як жонку ў дом прывядзеш, дык і сам за розум возьмешся. Добрую ж галаву маеш, хлопец. Шкада, калі ка́ту дастанецца.

З хвіліну шляхціц глядзеў ваўком, але потым, спахапіўшыся, згодна кіўнуў. Яго агіда да жаніцьбы, відаць, трохі астыла, калі ўспомніў аб прыгажосці Тышкевічаўны ды аб тых выгодах, якія абяцаў гэты шлюб.

— Няўжо пан ваявода так лёгка пагадзіўся аддаць за мяне дачку? — усё ж пацікавіўся ён. — Яму б Мар’яне сярод сенатараў пару шукаць.

— Не адразу, але пагадзіўся, бо я сам сватам быў... Такую дзяўчыну табе высватаў! Прыгожую як сонца, багатую і з магутнага ды добрага роду. А ты, няўдзячны, яшчэ носам круціш, — папракнуў князь Крыштаф.

Адам, які ўжо зусім супакоіўся, пацалаваў князю руку.

— І родны бацька для мяне не зрабіў бы такога, як твая княжацкая міласць, — прызнаў ён.

— Адразу б так, — задаволена буркнуў князь гетман. — Слухай мяне, Адам. Вазьмі ў маёй піўніцы бочку вугорскага і едзь цяпер да пана Тышкевіча. Утапіце з ім у віне вашы сваркі! Адзін толькі не ездзі, сватам пана Кахлеўскага вазьмі — той не толькі ваяводу, чорта загаворыць, калі трэба будзе. Бо ты сваім змяіным языком і святога давядзеш да граху... І яшчэ. Пра пасаг я з ваяводам не дамаўляўся, але, мабыць жа, моцна драць не будзе.

— Не будзе, — драпежна ўсміхнуўся буян. — Не турбуйся, міласцівы князь.

Падзякаваўшы гетману за клопат, Адам выйшаў, нізка пакланіўшыся. І быў так заняты сваімі думкамі, што не заўважыў Багуслава, які не зводзіў з яго вачэй.

Княжыч саскочыў з крэсла.

— Хто гэта быў? — зацікаўлена спытаў ён у дзядзькі.

— Сакові́ч, ашмянскі падкаморы*, — разгублена адказаў князь Крыштаф, які толькі цяпер пабачыў пляменніка. — Ну, шатан...

— І як толькі пан Тышкевіч пагадзіўся на такога зяця? — услых падумаў пан Мяржынскі, які ўвесь гэты час маўчаў і слухаў.

Гетман зіркнуў на яго, але ўсё-такі адказаў:

— Выбару ў яго не было. Не трэба было пану Тышкевічу крычаць на ўсю Літву пра сваю ганьбу. Толькі смеху нарабіў і свой дом зняславіў.

— Гэта і ёсць той самы Саковіч?

Багуслаў з надзеяй паглядзеў на дзверы, спадзеючыся, што яму прадставяць вядомага буяна, і шчыра пашкадаваў, пераканаўшыся, што таго ўжо і след прастыў.

Пан Адам Мацей Саковіч быў выбітнай асобай, пра якую пляткарылі ўсе, каму бог даў язык і ахвоту да плётак. Успаміналі яго неверагодную адвагу падчас апошняй вайны, на якую ён адправіўся яшчэ зялёным хлапчуком. Былі такія, хто казаў, быц-

* Падкаморы — суддзя ў Рэчы Паспалітай, які займаўся размежаваннем уладанняў. Быўураднікам земскага шляхецкага суда.

цам падчас бою ён уратаваў жыццё літоўскаму гетману, які з тых часоў прыкіпеў да юнага смельчака ўсёй душой. Але паколькі сам князь Крыштаф ніколі пра гэта не казаў, а Саковіч, калі яго пыталі, заўсёды адмоўчваўся, дык гэтыя чуткі чуткамі і засталіся. Усё ж сапраўдныя ці выдуманыя ваенныя подзвігі не перашкодзілі Адаму атрымаць добрую адукацыю. Да навук, асабліва да юрыспрудэнцыі, ён меў выдатныя здольнасці і здолеў здзівіць сваімі ведамі нават самога князя-канцлера Альбрэхта Радзівіла. Пры спрыянні абодвух Радзівілаў Саковіч заняў пасаду ашмянскага падкаморага і здолеў вярнуць сабе добры кавалак сямейных уладанняў, які адсудзілі прадпрымальныя сваякі, пакуль ён быў малы. Тыя паспрабавалі абараніць сваю праўду сілай зброі, думаючы, што будуць мець справу з недасведчаным хлопцам. Але пан падкаморы з хеўрай слуг, якія болей нагадвалі дзікіх разбойнікаў, учыніў лютую расправу з крыўдзіцелямі, не зважаючы ні на родную кроў, ні на хрысціянскую міласэрнасць. Жывы застаўся толькі адзін, ён потым казаў, што то былі не людзі, а чэрці пад загадам самога сатаны, які на тую ноч прыняў аблічча Саковіча. Паверылі яму ці не, але чапаць пана падкаморага ўжо ніхто не наважваўся, і яго асоба набыла дрэнную славу.

Багуслаў, вядома, смяяўся з гэтых выдумак, бо напэўна ведаў, што яго дзядзька не будзе мець справы з нячыстай сілай. А цяпер, прыгледзеўшыся да пана Саковіча, адчуў незразумелую сімпатыю. Ужо адкрыў рот, каб пацікавіцца ў князя-гетмана, дзе ў гісторыях пра ашмянскага падкаморага хлусня, а дзе праўда, але не паспеў.

— Ты да мяне па нейкай справе, Богусь? — пацікавіўся Крыштаф.

Княжыч моўчкі працягнуў дзядзьку лісты ад сясцёр. Той прачытаў іх і задуменна пачухаў патыліцу:

— Я павінен быў здагадацца, што Радзівілаўнам у гэтых галапузых немцаў, багатых толькі на тытулы, будзе нядобра, — з сумам азваўся князь ён. — Электар, хоць і годны чалавек, з-за вайны лішняга гроша за душой не мае і тое, чым пляменніц адорвае, у сваёй сям'і павінен з рота вырываць... Не хвалюйся, пляменнік.

Я ўсё зраблю, каб княжнаў дадому вярнуць, і зараз жа да іх слугу адпраўлю з грашыма, футрамі ды іншымі патрэбнымі рэчамі.

Князь выканаў сваё абяцанне, але потым мусіў пагадзіцца з меркаваннем саксонскай курфюрставай, што прынцэсам, якія ўжо амаль дасягнулі шлюбнага веку* і атрымалі нямецкае выхаванне, цяжка будзе прыстасавацца да новага жыцця. (Справа з апекай цягнулася гадамі і скончылася толькі са смерцю абедзвюх дзяўчат, што маладымі пайшлі ў лепшы свет.) Але тады ніхто не мог прадбачыць сумнага канца, таму князь гетман яшчэ раз запэўніў пляменніка, што ўсё будзе добра, і паведаміў выдатную навіну: паколькі Богусь рос надзіва разважлівым і разумным хлопцам, ён вырашыў узяць пляменніка з сабой у Варшаву, дзе вось-вось мусіў пачацца наступны сойм, — каб той патроху прывучаўся да грамадскіх спраў.

* Лізавета Элеанора мелася выйсці замуж за сына электара Саксоніі.

Раздзел 3

# РАКАШАНІН

*Варшава*
*(1631 год)*

Доўгая дарога ў Варшаву падалася Багуславу не такой нуднай, як мінулая паездка ў Літву. Яго сябры засталіся ў Кейданах, але князь Крыштаф быў у гуморы і забаўляў пляменніка аповедамі пра свае ваенныя паходы. Калі ж ён замаўкаў, размову падхоплівала князёўна Катарына, якая напрасілася ў гэтую паездку, нягледзячы на бацькаў супраціў. Аднак упартая князёўна не прывыкла атрымліваць адмовы і магла сказаць «так» нават тады, калі ўвесь свет навокал казаў «не».

Варшава не зрабіла на княжыча добрага ўражання, дый, шчыра кажучы, любавацца горадам не было часу. Не паспеў літоўскі гетман пераступіць парог уласнага дома, як яго атакавалі пасланцы праваслаўнага духавенства, што прыбылі на гэты сойм бараніць грэцкую веру ад каталікоў і ўніятаў. Яны бачылі ў літоўскім гетмане адзінага заступніка і абаронцу, і, трэба сказаць, што Радзівіл апраўдваў іх давер. Убачыўшы чужых, Катарына адразу ж выйшла з пакоя. Багуслаў хацеў ісці за ёй, аднак князь Крыштаф затрымаў яго, весела сказаўшы русінам, што іх выслухаюць абодва Радзівілы. Заклапочаныя аблічча паслоў аж пасвятлелі. Падзякаваўшы князям за такі гонар, яны пачалі.

— Толькі на вас, прасветлы князь, спадзяёмся, — нізка пакланіўшыся, загаварыў пан Крыса, пасланнік кіева-пячэрска-

га архімандрыта Пятра Магілы*. — На бога і на вас, але перш за ўсё на вашу міласць. Каму, як не вам, ведаць пра цяжкія крыўды, якія церпяць усе некатолікі ў Рэчы Паспалітай?

— Ведаю, усё ведаю, — цяжка ўздыхнуў князь Крыштаф, кальвініст, што ніяк не мог атрымаць вялікую гетманскую булаву, якую, па агульным перакананні, ужо сто разоў заслужыў на полі бою, паколькі кароль Жыгімонт, фанатычны каталік, адкрыта адмаўляўся даваць пасады іншаверцам. — Калі наш кароль заняў трон, ледзь не палова ўсіх сенатараў былі дысідэнтамі. А цяпер? Толькі чацвёра, калі лічыць мяне самога!

— І ніводнага грэцкай веры, — рэхам адазваўся Крыса. — Ніводнага! І калі б не заступніцтва вашай міласці, нас, праваслаўных, і слухаць ніхто не стаў бы. Ці ж даўно мы сваіх нябожчыкаў павінны былі ўначы хаваць? І да гэтага часу публічныя працэсіі пад забаронай засталіся.

— Няўжо не ганьбай для караля і ўсёй Рэчы Паспалітай з'яўляецца тое, што любы шляхціц можа вольна чыніць разбой у царкоўных маёнтках? — пачаў скардзіцца іншы бацюшка. — Столькі праваслаўных святароў заплацілі жыццём за спробы спыніць гэтае свавольства! А ці ўмяшалася каралеўскае правасуддзе? Ці пакарала сурова вінаватых? Госпадзе, ты ўсё бачыш! А падаткі, што спаганяюцца ў каралеўскі скарб выключна з праваслаўнага духавенства? Мы, слугі божыя, заўсёды гатовыя падтрымаць патрэбы яго вялікасці. Але чаму такая несправядлівасць? Чым ксёндз або ўніяцкі парох лепшы за праваслаўнага папа? Чаму ж толькі нас павінны закранаць каралеўскія капрызы? Ох, калі кароль не адумаецца, разбурыцца Рэч Паспалітая!

— Караля нават іерусалімскі патрыярх Феафан не пераканаў, — сказаў князь Крыштаф, які ўсё гэта чуў не ўпершыню, бо пра гэта гаварылі ў сойме цягам апошніх дванаццаці гадоў. — Аднак я буду бараніць правы праваслаўнай царквы гэтак жа ўпарта, як бараню сваю веру ад каталіцкага самаўладдзя.

* Пётр Магіла (1596—1646) — украінскі палітычны і царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай, асветнік, архімандрыт Кіева-Пячэрскага манастыра з 1627 года, мітрапаліт Кіеўскі, Галіцкі і ўсяе Русі з 1633 года. У 1996 годзе кананізаваны.

Абнадзееныя княжацкімі абяцаннямі, пасланцы сышлі, а цікаўны Багуслаў спытаў у дзядзькі, чаму той, кальвініст, бярэ так блізка да сэрца клопаты праваслаўных. Князь Крыштаф даў нечаканы адказ.

— Каталікі ўжо ўзялі за горла ўсіх іншаверцаў і знішчаць па адным, калі ў нас не хопіць розуму трымацца разам. Вядома, праваслаўная царква — гэта вялікія клопаты, бо трэба мець мужнасць, каб бараніць тое, ад чаго ўсе адвярнуліся. Але гэта і вялікая сіла. Ты, Богусь, павінен гэта ведаць, каб павярнуць тую сілу сабе на карысць, бо ты — князь слуцкі і, дасягнуўшы паўналецця, разам з бацькавай спадчынай атрымаеш найбуйнейшую праваслаўную епархію ва ўсёй Літве. На цябе будуць аглядацца і патрыярх, і кіеўскі мітрапаліт... Вядома, калі кароль пагодзіцца аднавіць Кіеўскую мітраполію, бо толькі ад цябе залежыць, хто са святароў які прыход будзе мець у тваіх уладаннях, ды і само існаванне праваслаўя ў Слуцку таксама будзе залежаць ад цябе. А людзей заўсёды шануй за іх добрыя якасці, а не за тое, якую веру яны вызнаюць.

— Я буду памятаць, — сказаў княжыч і моцна задумаўся над гэтымі словамі.

Аднак дзядзька павярнуў яго думкі ў іншы бок, паведаміўшы, што заўтра жадае прадставіць пляменніка каралю Жыгімонту. Багуслаў нахмурыўся. У Літве ён нямала наслухаўся пра варожасць паміж каралём і сваім бацькам, у смерці якога сёй-той вінаваціў менавіта Жыгімонта. Так гэта было ці не, але пасля смерці зацятага ворага кароль перанёс нянавісць на князя Крыштафа, супраць звычаю перадаўшы і Віленскае ваяводства, і вялікую гетманскую булаву Льву Сапегу — мудраму дзяржаўнаму мужу, але нікчэмнаму ваяру. Менавіта таму падчас апошняй вайны шведам удалося прыбраць да рук значную частку Літвы. Князь Крыштаф, не зважаючы на абразу, выбіў непрыяцеля з межаў Айчыны, але каралеўскай падзякі за гэта так і не атрымаў.

Нядобразычліўцы Радзівіла ўмела распальвалі Жыгімонтаву непрыязнасць, абвінавачваючы князя ў спробах пасадзіць на польскі трон то французскага прынца Гастона Арлеанскага, то шведскага караля Густава Адольфа. Адбіваючыся ад паклёпаў, князь Крыштаф упарта шукаў дружбы з каралеўскім дваром, хоць

як адзін з самых багатых магнатаў Рэчы Паспалітай мог абысціся без каралеўскае міласці. Заўважыўшы, што пляменнік не выказаў радасці ад наведвання палаца, ён падбадзёрліва ўсміхнуўся, хвалюючыся, каб той выпадкова не разгубіўся ад бляску каралеўскага двара:

— Не бойся.

— Чаго я маю баяцца? — не зразумеў Богусь. — Я бачыў караля яшчэ два гады таму, калі мы з маці наведвалі Варшаву па дарозе ў Літву. Кароль, жадаючы зрабіць ёй прыемнасць, прапанаваў мне ў яго застацца, але я на гэта адказаў, што не хачу.

Успомніўшы нябожчыцу княгіню, ён яшчэ больш нахмурыўся, а дзядзька, не жадаючы верадзіць яшчэ свежую рану пляменніка, пакінуў гэтую размову.

Назаўтра ўсе Радзівілы паспяшаліся ў каралеўскі палац. Князёўна Катарына была трохі напалоханая, але гэтая нервовая бледнасць вельмі пасавала яе ганарліваму прыгожаму абліччу і раскошным залаціста-рудым валасам. Княжыч адчуваў сябе ў каралеўскім палацы гэтак жа вольна, як і ў дзядзькавым доме. У Вялікую залу зайшоў спакойна, не звяртаючы ўвагі на шэпт прыдворных за спінай, а, апынуўшыся перад тронам, са змрочнай цікавасцю зірнуў у вочы каралю.

Жыгімонт быў ужо старым і хворым чалавекам. Яго жыццё падыходзіла да канца, ад чаго вялікую палёгку адчувалі ўсе дысідэнты і патрыёты. Гэты Ваза, заняўшы каралеўскі пасад, уцягнуў Рэч Паспалітую ў шэраг войнаў, жадаючы любой цаной захаваць за сабой шведскую карону і нават зрабіцца маскоўскім царом. Але на шчасце і для шведаў, і для маскавітаў, рэлігійныя перакананні перашкодзілі манарху скарыстацца наступствамі перамог. Заваяваўшы тытулы, ён не дасягнуў запаветнай абсалютнай улады нават ва ўласнай дзяржаве.

Цяпер стары воўк стомлена адкінуўся на спінку трона і, склаўшы рукі на грудзях, зацікаўлена разглядаў сына свайго найбольшага ворага. Багуслаў вельмі вырас з часу іх апошняй сустрэчы. Затым кароль пакасіўся на князя Крыштафа.

— Мы рады бачыць і цябе, князь, і тваю дачку, і пляменніка, — ласкава сказаў Жыгімонт, аднак яго халодны позірк ясна даваў

зразумець, што літоўскаму гетману не варта мець ніякіх ілюзій. Каранаваны фанатык бачыў у ім не таленавітага военачальніка, а ерэтыка, якому месца ў пекле, а не ў каралеўскіх пакоях.

Князь Крыштаф нізка пакланіўся. Катарына дрыготкімі пальцамі ўзялася за край сукенкі і цырымонна прысела. Багуслаў нават галавы не нахіліў, стаяў роўна і ўважліва разглядаў караля. Але чары яго прыгажосці ўжо падзейнічалі на Жыгімонта і растапілі лёд яго душы.

— Якое прыгожае дзіця! — літасціва ўсміхнуўся ён і зрабіў знак Багуславу, каб падышоў бліжэй.

Але каралеўская ўсмешка адразу ж знікла, калі «прыгожае дзіця», смела падышоўшы да трону, падало каралю руку для прывітання.

— Хто ж так вітае караля, пляменніку? — падбег збялелы ад неспадзяванкі князь Крыштаф. — Падай у ногі яго вялікасці і...

— Што? — аж скалануўся хлопец, але тут жа апанаваў сябе і дадаў ужо спакайней: — Чаму я павінен гэта рабіць? У рэшце рэшт, кароль такі ж чалавек, як і я.

У зале настала такая цішыня, што чуваць было, як дзесьці гудзе яшчэ сонная вясновая муха. Жыгімонт нахмурыўся, і, заўважыўшы, што ўсе погляды ў зале звернутыя на яго, прымусіў сябе зарагатаць.

— Дайце яму спакой, — звярнуўся ён да князя Крыштафа, які, не чакаючы такога нахабства ад пляменніка, яго рэзка адчытваў, і да маршалка каралеўскага двара, які ўслых абураўся такой непачцівасцю. — Ракашанін!

На гэтым аўдыенцыя і скончылася. Вядома, потым князь Крыштаф яшчэ доўга папракаў пляменніка за неразважлівыя паводзіны, хоць і добра разумеў іх прычыны. Але цяпер не час быў для выхаваўчай гутаркі. Развітаўшыся з Жыгімонтам, гетман міла загаварыў з яго сынамі — каралевічамі Уладзіславам і Янам Казімірам, якія падышлі прывітацца.

Мяккія словы Уладзіслава вельмі адрозніваліся ад бацькавых сечаных фраз, а што тычыцца Яна Казіміра, дык яго посны твар крыху памякчэў, калі ён убачыў князёўну Катарыну. Пакуль старэйшы брат гутарыў з князем-гетманам, ён ласкава загава-

рыў з дзяўчынай. Відаць было, што яе прыгажосць кранула каралевіча, і Катарына, заўважыўшы гэта, зусім акрыяла і пачала размаўляць з прынцам так смела, як можа дазволіць сабе толькі прыгожая дзяўчына ды яшчэ і радзівілаўскага роду.

Багуслаў заўважыў, што і Уладзіслаў зацікаўлена глядзіць у бок князёўны, спрабуючы пачуць, пра што яна шчабеча з братам. Скончыўшы размову з гетманам, ён падышоў да Радзівілаўны і папрасіў у яе прабачэння за халодны каралеўскі прыём.

— Нічога, каралевіч, — сказала на тое Катарына. — Калі я спачатку трохі і замерзла, дык цяпер вашыя міласцівыя словы мяне зусім адагрэлі.

Пераканаўшыся, што дачка авалодала сабой лепш за пляменніка, князь Крыштаф запрасіў абодвух каралевічаў на вячэру. Уладзіслаў з радасцю прыняў запрашэнне, а Ян Казімір доўга вагаўся, муляўся і нарэшце сказаў, што прыйдзе, калі дазволяць кароль і важныя справы.

Кароль, відаць, усё ж дазволіў, бо ў прызначаны дзень абодва каралевічы з'явіліся на парозе княжацкага палаца. Тут былі першыя асобы Вялікага Княства і Кароны, з якімі князь Крыштаф падтрымліваў сяброўскія адносіны. Сеўшы па правую руку ад гаспадара дома, Уладзіслаў пасадзіў Катарыну побач і ўвесь вечар займаў яе прыветнай гутаркай, зрэдку адрываючыся, каб сказаць нешта прыемнае князю Крыштафу ці каму-небудзь з гасцей. Ян Казімір, які сядзеў насупраць, сказаў за вячэрай усяго некалькі слоў, а яго аблічча рабілася ўсё больш змрочным па меры таго, як весялеў твар яго брата. Затое калі Катарына, паспрачаўшыся пра нешта з Уладзіславам, папрасіла, каб ён рассудзіў іх спрэчку, Ян Казімір так узрадаваўся, што, зрабіўшы гэта, неадкладна выпрасіў сабе ва ўзнагароду магчымасць танца з прыгажуняю. Цяпер надышла чарга Уладзіслава хмурыцца і адмоўчвацца, што ён і рабіў, пакуль не завалодаў рукой князёўны. І руку яе адпусціў толькі тады, калі надышоў час вяртацца дадому.

Пасля гэтага вечара Катарына бы зноў на свет нарадзілася. Некалькі разоў Багуслаў бачыў, як чыесьці слугі перадавалі яе слугам таямнічыя пасланні, і дзяўчына, прачытаўшы іх, цэлы дзень лётала як на крылах, напяваючы ўголас нейкую песень-

ку. Назіраючы за сястрой, княжыч спрабаваў адгадаць, хто ж з прынцаў слаў тыя цыдулкі. Так і не здагадаўшыся, спытаў пра тое ў самой князёўны. Катарына аджартавалася, але з тых часоў стала больш асцярожнай, напэўна, баючыся не так назіральнага кузэна, як грознага бацькі.

Але князь Крыштаф, заняты справамі сойма, папросту не заўважаў нічога, што не тычылася палітыкі. Надышлі дні, калі пышныя абеды ў княжацкім палацы і натоўпы наведнікаў, якія праглі пачуць Радзівілаву параду, змяніліся сумнай цішынёй у пакоях. Яе зрэдку парушалі толькі крокі радзівілаўскіх сваячак, што наведвалі князёўну. Князя-гетмана не было дома цэлыя дні. Ішоў з раніцы і прыходзіў ноччу, часта ў суправаджэнні вяльможных асоб, з якімі доўга пра нешта размаўляў, зачыніўшыся ў спальні.

* * *

Раз Багуслава разбудзілі ўначы галасы, якія гучалі з вітальні. Княжыч узрадаваўся, зразумеўшы, што прыйшоў князь Крыштаф. Жадаючы павітацца з дзядзькам, ён спехам апрануўся і, спусціўшыся па сходах, прайшоў у малую гасцёўню, праз няшчыльна прычыненыя дзверы якой праходзіла святло. Зразумеўшы, што князь не адзін, хлопец разгублена спыніўся, а затым асцярожна зазірнуў. Акрамя князя Крыштафа, у вітальні было некалькі чалавек, сярод якіх Багуслаў пазнаў нясвіжскага ардыната, князя Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла, і яго братоў: камандора Мальтыйскага ордэна Жыгімонта Караля і літоўскага крайчага Аляксандра Людвіка — жыццярадаснага таўстуна, чыя круглявая постаць патанала ў пене карункаў французскага камзола, які так шчыльна аблягаў вялікі жывот князя, што, здавалася, вопратка вось-вось лопне. Усе гэтыя Радзівілы былі каталікамі, таму паміж імі і іх біржанскімі сваякамі-евангелістамі асаблівай прыязнасці не было. Убачыўшы дзядзьку ў такім таварыстве, Багуслаў застаўся стаяць за дзвярыма, толькі трохі адступіўшы ўбок, далей ад святла, бо баяўся, што яго выдасць хісткі цень. Зрэшты, сваякі былі так занятыя размовай, што нічога не заўважалі. Таму княжыч зноў зазірнуў у пакой і толькі цяпер пабачыў яшчэ аднаго чалавека,

які сядзеў на кукішках перад амаль загаслым камінам і спрабаваў разварушыць агонь, падкідваючы дровы. Пакуль князі размаўлялі пра соймавыя справы, ён не ўмешваўся, затое калі гаворка зайшла пра слабое здароўе караля, вырашыў уставіць колькі словаў.

— У каралеўскім палацы ўжо пахне мярцвячынай, — холадна запярэчыў ён нясвіжскаму князю, які крывадушна і шматслоўна казаў пра хуткае адужанне яго вялікасці. — А той, хто думае інакш, толькі падманвае сам сябе.

І, звяртаючыся да князя Крыштафа, з паклонам дадаў:

— Старэйшы каралевіч так дагаджае вашай княжацкай міласці, бо добра разумее, што яго элекцыя шмат у чым будзе залежаць ад Радзівілаў, і асабліва ад таго з іх, хто мае войска, а значыць, і сілу. Бо наш «вялікі» гетман Сапега ў свае гады і на каня не сядзе. А калі і сядзе, дык толькі для таго, каб людзей насмяшыць.

Багуслаў адразу пазнаў гэты моцны выразны голас, які, нягледзячы на сваю мяккасць, меў дзіўную здольнасць напаўняць сабою ўвесь пакой. Князь Крыштаф, якому не дужа спадабалася гэтая смелая прамова, трохі нахмурыўся.

— Пан Саковіч мае дрэнную звычку гаварыць пра ўладароў так, нібы ідзецца пра іх слуг, — сказаў ён. — Але ў цэлым мае рацыю. З павагі да караля я б з радасцю адклаў гэтую размову да яго смяротнай гадзіны, але, баюся, будзе занадта позна. Гаворка пойдзе пра інтарэсы нашага дому...

— Чаму ж тады я не бачу тут нашых сваякоў — клецкага князя і літоўскага канцлера? — спытаў камандор і, шматзначна азірнуўшыся, спыніў погляд на Саковічу, нібы кажучы: «Мы — Радзівілы, а ён хто такі?»

— Я давяраю Адаму, — патлумачыў гетман, слушна зразумеўшы гэты погляд. — Што тычыцца нашых кузэнаў, дык я, вядома, пагавару з імі, калі мы прыйдзем да згоды.

— Дык пра што гаворка? — пазяхнуў князь Альбрэхт Уладзіслаў. — Кажы, Крыштаф, на вуліцы глыбокая ноч...

— Пра асобу нашага новага караля, — сказаў князь гетман.

— Во як! — здзівіўся Аляксандр Людвік. — Я думаў, што каралевіч Уладзіслаў як старэйшы сын караля мае неаспрэчнае права заняць пасад.